Распаўсюджанай практыкай становіцца падтрыманне буйнымі, багатымі арганізацыямі і безнесменамі культурных праектаў. Стасункі мецэнатаў і спонсараў з суб'ектамі культуры, у працэсе сумеснай працы над праектамі ў сферы культуры, у сучасных умовах набываюць іншыя формы. Тым не менш, гэта стымулюе культурнае жыццё і спрыяе развіццю культры і мастацтва.


1. *Барышев, Г. И.* Театральная культура Белоруссии XVIII века / Г. И. Барышев. – Мінск : Навука і тэхніка, 1992. – 293 с.

2. Гісторыя беларускага тэатра : у 3-х т. / рэдкал.: У. І. Няфёд (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Навука і тэхніка, 1983–1987. – Т. 1. Беларускі тэатр ад вытокаў да Кастрычніка 1917 г. / рэд. Г. І. Барышаў, А. В. Сабалеўскі . –1983. – 496 с.

3. *Данилов, С. С.* Очерки по истории русского драматического театра / С. С. Данилов. – М., Л. : Искусство, 1948. – 588 с.

4. *Няфёд, У. І.* Беларускі тэатр / У. І. Няфёд. – Мінск : Выд-ва АН БССР, 1959. – 399 с.

5. *Няфёд, У. І.* Гісторыя беларускага тэатра : вучэб. дапаможнік для тэтр.-маст. ін-та / У. І. Няфёд. – Мінск : Выш. шк., 1982. – 543 с.

6. *Патоцкі, Л.* Успаміны пра Тышкевічаву Свіслач, Дзярэчын і Ружаны / Л. Патоцкі ; укл., прадмова, камент. А. М. Філатавай ; пер. з пол. І. У. Саламевіча. – Мінск : Полымя, 1997. – 270 с.

7. *Смольскі, Р. Б.* На скрыжаванні: Тэатр у працэсах станаўлення і развіцця гістарычнай і нацыянальнай свядомасці беларусаў / Р. Б. Смольскі. – Мінск : Беларус. навука, 1999. – 231 с.

8. *Rulikowski M.* Teatr Polski na Litwie (1784–1906) / M. Rulikowski. – Wilno. – «Kurjera Litewskiego», 1907. – 107 p.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Г. А. КАРПЕЧЭНКО

# СТАНАЎЛЕННЕ БІРЖАНСКАЙ АРДЫНАЦЫІ ТЫШКЕВІЧАЎ

Зараз у беларускай навуке з прадстаўнікоў шматлікага роду Тышкевічаў больш даследаваны браты Канстанцін і Яўстах. Цікавасць навукоўцаў прыцягваюць і іх музеі ў Лагойску і Вільна. Аднак у XIX ст. шырокую вядомасць набылі і іншыя прадстаўнікі гэтага роду – генерал Тадэвуш Тышкевіч, палкоў-

нік Міхал Тышкевіч, калекцыянер М. С. Тышкевіч і г. д. Яны валодалі шырокімі зямельнымі ўгоддзямі ў межах сучаснай Беларусі, Літвы і Украіны. Сімвалам іх поспеху можа служыць стварэнне другой ардынацыі – біржанскай (першая – лагойская). Але шлях яе стварэння сустрэў вялікія складанасці.

Падчас свайго побыту ў Пецярбургу Тадэвуш Баброўскі наведваў салон Рдултоўскага і адзначыў у сваіх мемуарах: «У него (Рдултовского) я познакомился с … несколькими членами семьи Тышкевичей: Евстахием, известным польским археологом, Ясем и Михалом, симпатичными молодыми людьми, которых привлекло туда дело о графском титуле, а поддержкой и опорой этого дела был пользовавшийся благосклонностью Его Величества специально прибывший предводитель дворянства Киевской губернии граф Генрик, увешанный орденами сановник. Трудность дела состояла в том, что диплом, хоть и датированный еще XVII веком, никогда не был государственными органами Речи Посполитой подтвержден; дело, стало быть, заключалось в представлении свидетельства Литовской Метрики о том, что когда-то диплом был занесен в акты, что Малевский, главный метрикант, категорически отказывался подтвердить. После безуспешных уговоров и просьб прибегли к более красноречивому аргументу и пожертвовали Малевскому 15 000 рублей … чем дело окончательно и погубили, так как, задетый за живое, он заявил, что до тех пор, пока он метрикант, подобное свидетельство из метрики никогда не выйдет. Волей-неволей дело пришлось отложить … Кроме общей трудности подтверждения титулов, Император Николай испытывал личную неприязнь к богатейшему из Тышкевичей, Бенедикту, из-за его биржанского дела с Радзивиллами, которое тот выйграл взятками…» [3, с. 688–689].

Узгаданая справа брала свой пачатак у 1811 г., калі стараста велатыцкі Юзаф Тышкевіч атрымаў Біржы ад князя Дамініка Радзівіла. Князь Радзівіл меў вялікія даўгі, а граф Тышкевіч быў ягоным крэдыторам. Ад таго Ю. Тышкевіча пайшла галіна, якую называюць Велатыцкай, Біржанскай ці Валожынскай. Я. Тышкевіч узгадваў хлуслівыя чуткі таго часу, што Тышкевічы Велатыцкія не маюць дачынення да Тышкевічаў, графоў у Лагойску і Бярдзічаве, што магло быць абумоўлена зайздрасцю да багаццяў велатыцкай галіны, адсутнасцю дакладнай ін-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

фармацый або злым намерам. Насамрэч гэта быў адзіны дом з адзіным гярбом [6, с. 98].

Правамернасць валодання Біржамі была аспрэчана нашчадкамі памерлага ў 1813 г. князя. У 1816 г. імператарскім указам у Вільне была створана Радзівілаўская камісія, мэтай якой быў разгляд заблытаных фінансавых і юрыдычных становішчаў маёнткаў дачкі князя Дамініка Радзівіла Стэфаніі. Старшынямі камісіі былі А. Пацей, А. Лахніцкі, М. Ромер, Ф. Верашчака, А. Лапа і сенатар Дубамель. Камісія скончыла сваю працу ў 1838 г. Сама ж Стэфанія Радзівіл выйшла замуж у 1828 г. за князя Вітгенштэйна, а памерла ў маладым узросце ў 1832 г. Муж атрымаў у спадчыну ад яе, пасля разлічэння з крэдыторамі, 42 000 душ [6, с. 99–100].

У НГАБ захавалася справа «Дело по прошению поверенных Радзивилловской массы и гр. Тышкевича о выдаче им купчих крепостей на им. Биржи Виленской губ., совершенных между гр. М. Тышкевичем и наследниками кн. С. Радзивилл», дзе закранаецца пытанне падлога купчых. Мінскі грамадзянскі губернатар пісаў у мінскую палату грамадзянскага суда: «Главноуполномоченный па делам Радзивилловской массы помещик подольской губернии Кожуховский в поданом ко мне прошении изъясняет, что он делая лично справку в Книгах Гражданской Палаты за 1811 год для записки крепостей и входящих бумаг и нашел явное доказательство подлога в особенности по совершению купчей крепости на имение Биржи приобретенное от Князя Радзивилла графом Тышкевичем» [2, с. 38]. На што быў дадзены адказ: «1837 года октября 4 дня Члены Минской Палаты Гражданского суда … рассматривали подробно книги 1811 года Крепостную и входящим бумагам [2, с. 39]. Г. Прокурор, основываясь на отзыве Господина губернатора … объявил, что вышепрописанные по Крепостной Книге за 1811 г. малозначищиеся ошибки находит он произошедшими от небрежности Надсмотрщика Крепостных дел, а усмотренные по Входящему регистру за тот же год неисправности – от непорядочного ведения онаго Регистратором сей палаты; но чтобы в записке в Крепостные Книги Купчей Крепости, выданной марта 15 1811 года поверенным Князя Доминика Радзивилла Графу Тышквичу на имение Биржи, совершенной сентября 11 дня, а так же прочих по оной актов сокрывался какой-либо



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

поставляемый Г. Кожуховским и без указания в чем именно и на каком месте учинен подлог, сего не замечает …» [2, с. 41–42]. Аднак і іншы бок канфлікту меў прэтэнзіі да мінскай палаты грамадзянскага суда, аб чым сведчыць наступны ліст: «Адвокат Виленской Гражданской Палаты Станислав Сидорович, в поданном мне прошении от имени Графа Михайла Тышкевича, жалуется на Гражданскую палату в том, что по просьбе поверенного Тышкевича отказала ему в выдаче засвидетельствованных копий с актов, внесенных в книгу прежде и после записки купчей крепости на имение Биржи под предлогом, что означенные акты суть для верителя, его сторонними; тогда как было объяснено, что просимые копии необходимо нужны для оправдания для чинимых Радзивиловскою Прокураториею изветов, и при том Палата по домагательству противной стороны 23 Августа выдала Прокуратории много посторонних документов, в том числе копию, или список всех актов, совершенных в 1811 г.» [2, с. 58].

Узгаданы Міхал Тышкевіч быў сынам Юзафа. Падчас вайны 1812 г. ён за ўласны кошт сфарміраваў і ўзначаліў 17-ты полк уланаў літоўскіх для напалеонаўскай арміі. Характарыстыкай М. Тышкевіча можа паслужыць выпадак, апісаны М. Маліноўскім: «…У старэйшую дачку пані Агінскай, удавы Міхала, паненку Іду, якая была надзвычай прыгожая, закаханы быў Бенядзікт Тышкевіч, бацька яго Міхал не жадаў гэтага і прагнуў, каб сын ажаніўся з Вандай Ванькавічанкай. І вось аднойчы ён прыйшоў да пані Агінскай, а быў гэта ўжо 60-гадовы стары, прасіць рукі паненкі Іды і дадаў, што будучая яго жонка павінна цешыцца тым, што ёй не давядзецца доўга цярпець і можа спадзявацца на завяшчанне. Маці вельмі ахвотна з гэтым пагадзілася, паабяцала графу падрыхтаваць і схіліць да гэтага дачку. Бенядзікт быў у вялікай распачы, калі, прыйшоўшы аднойчы да пані Агінскай, пачуў, што паненка Іда, падрыхтаваная маткай, заявіла, што ніколі яго не кахала, што ніколі б не пайшла за яго замуж. Крануты гэтым за жывае, Бенядзікт паехаў да бацькі, сказаў яму, што згодны жаніцца з Вандай Ваньковіч; ашчасліўлены гэтым бацька паскорыў іх шлюб, а сам ужо ніколі не бываў у пані Агінскай, якую вельмі разгневала гэтае фіглярства…» [1, с. 112]

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Як адзначаў Я. Тышкевіч, згодна з дамовай, права Тышкевічаў на валоданне Біржамі існавала толькі да згасання галіны Нясвяжскіх Радзівілаў па мужчынскай лініі. Потым маёнткі павінны былі быць перададзены спадчыннікам князёў Радзівілаў, а Тышкевічам жа належала вярнуць заплочаныя імі грашовыя сродкі. Спадчыннікам, па звестках Я. Тышкевіча, праз свайго пасла ў Пецярбурге выступаў кароль Баварыі. Аднак указ імператара Мікалая І дазволіў продаж маёнтка людзям, не звязаным з Радзівіламі. У выніку баварскае запатрабаванне было анулявана [6, с. 100]. Гэты ўказ выйшаў у 1844 г. і такім чынам справа была выйграна на карысць унука Юзафа Яна Тышкевіча. Па звестках Т. Баброўскага права валодання Біржамі аспрэчвалі іншыя прадстаўнікі рода Радзівілаў [3, с. 826].

Ян Тышкевіч утварыў Біржанскую ардынацыю ў 1860 г. [7, с. 368], але ён не меў дзяцей. Яго брат Бенядзікт ад шлюбу з Вандай Ваньковіч пакінуў толькі дачок. Другім ардынатам біржанскім стаў іх пляменнік Міхал – знакаміты калекцыянер і падарожнік, член Віленскай археалагічнай камісіі, які адрокся ад ардынацыі на карысць сына Юзафа. Аднак і ён у сваю чаргу саступіў свайму брату Яну [7, с. 369]. Пятым ардынатам стаў сын Яна Альфрэд, шостым – сын Альфрэда Ян Ежы, які ўвогуле не цікавіўся сямейнымі ўладаннямі і стаў манахам-трапістам [5, с. 130]. Такім чынам ардынацыя існавала да 1921 г. і выгасла на беспатомным Яне Ежы Тышкевічы.

Хаця ў Біржах і знаходзіўся радзівілаўскі замак, першы ардынат Ян Тышкевіч палічыў за лепшае ў 1844 г. пабудаваць асобны палац у фальварку Аструў, які зараз уваходзіць у склад Біржаў. Ян Тышкевіч паклаў таксама пачатак збіральніцтва багатай бібліятэкі, рэчаў мастацтва, сямейнага архіва менавіта ў гэтым маёнтку. У склад біржанскай ардынацыі ўваходзілі 17 буйных маёнткаў, 181 вёска, 77 невялікіх сядзіб і 36 фальваркаў на тэрыторыі Паневяжскага, Шавельскага, Вількамірскага і Упіцкага паветаў. Агульная колькасць зямлі складала 73 215 дзесяцін [4, с. 62].

Такім чынам, у XIX ст. асаблівага росквіту дасягнула біржанская галіна Тышкевічаў. Частка іх шырокіх уладанняў лягла ў аснову біржанскай ардынацыі. Самі ж Біржы канчаткова трапілі ад нашчадкаў Стэфаніі Радзівіл да Тышкевічаў толькі праз шэраг доўгіх судовых спрэчак.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

1. *Маліноўскі, М.* Кніга ўспамінаў / М. Маліноўскі ; уклад., прадм., камент. і імянны паказальнік А. Фядута ; пер. с пол. Я. М. Кісялёва. – Мінск : Лімарыус, 2014. – 238 с.

2. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). – Ф. 146. Воп. 2. Спр. 61.

3. Поляки в Петербурге в первой половине XIX века : сб. / сост., предисл., коммент. А. И. Федуты / подгот. текста воспоминаний О. А. Пржецлавского ; пер. с пол. Ю. В. Чайникова. – М. : Новое литературное обозрение, 2010. – 908 с.

4. *Narkowicz, L.* Muzealnicy i kolekcjonerzy: zbiory rodziny Tyszkiewiczów i ich rola w zaborze rosyjskim / Liliana Narkowicz. Wrocław : Wrocławskie Towarzystwo Naukowe. Wydawnictwo, 2013. – 298 s.

5. *Patkowski, R.* Działalność naukowo-badawcza i społeczno-kulturalna Eustachego i Konstantego Tyszkiewiczów / R. Patkowski // Lituano-Slavica poznaniensia. – 2008. – № XIII. – S. 121–167.

6. *Tyszkiewicz, E.* Birże: Rzyt oka na przeszłość miasta, zamku i ordynacyi / [Eustachy Tyszkiewicz]. – St.-Petersburg, 1869. – 171 s.

7. *Żychliński, T.* Złota księga szlachty polskiéj / T. Żychliński. – Poznań : nakł. i drukiem Jarosława Leitgebra, 1883. – S. 333–376.

О. М. СОКОЛОВА

## ТЫШКЕВИЧИ В ИСТОРИИ ГОРОДА МИНСКА

Важную роль в развитии Минска сыграла деятельность представителей знатных родов Радзивиллов, Огинских, Завишей, Сапег и др., занимавших высшие государственные должности, в том числе принимавших непосредственное участие в городском управлении. Их административная, а также благотворительная и меценатская деятельность оказывала большое влияние на изменение культурного пространства Минска.

Среди магнатских родов, формировавших культурный облик города, были и Тышкевичи. Из письма великого князя литовского Жигимонта I от 28 марта 1541 г. становится известно, что в начале XVI в. один из старших сыновей Тышки Калениковича, родоначальника рода Тышкевичей, Леон укреплял Минское замчище [3, с. 9]. В начале XVI в. старостами минскими являлись Дмитрий Скумин-Тышкевич, после – его сын

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ